Каханоўскі, А. Г. Статыстычныя крыніцы па гісторыі Беларусі 60-90 гг. XIX ст. / А. Г. Каханоўскі // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 2 / Рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.) і інш. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 193–200.

**А. Г. Каханоўскі**

## Статыстычныя крыніцы па гісторыі Беларусі 60—90 гг. XIX ст.

Статыстычныя крыніцы ўяўляюць сабой значны і складаны корпус гістарычных дакументаў. Пачатак іх фарміравання як сістэмы дадзеных традыцыйна звязваюць з 1860-мі гадамі, калі быў створаны Цэнтральны статыстычны камітэт (ЦСК) МУС. Да гэтага часу статыстыка была прадстаўлена галоўным чынам статыстычнымі дадаткамі да справаздач губернатараў. Цэнтральным і губернскімі статыстычнымі камітэтамі за гады дзейнасці быў назапашаны агромністы масіў дадзеных, значная частка якога апублікавана на старонках спецыялізаваных выданняў таго часу «Статистический Временник Российской империи» (1866—1890 гг.), «Статистика Российской империи» (1887—1917), «Временник Центрального статистического комитета» (1888—1903). Для характарыстыкі сацыяльных працэсаў у Беларусі 60—90-х гадоў XIX ст. найбольшую цікавасць уяўляюць матэрыялы дэмаграфічнай, аграрнай, прамысловай статыстыкі, а таксама статыстыкі працы, якая пераважна звязана з дзейнасцю фабрычна-заводскіх інспектараў. Трэба ўлічваць таксама, што асаблівасцю статыстычнага ўліку ў Расійскай імперыі была адсутнасць адзінай сістэмы збору і апрацоўкі статыстычных звестак. Да канца XIX ст. у беларускіх губернях сфарміраваліся два асноўныя тыпы ўліку: першы быў звязаны з дзейнасцю і падкантрольны ЦСК, другі праводзіўся асобнымі міністэрствамі і ведамствамі. Земская статыстыка ў беларускіх губернях у разглядаемы час адсутнічала. У дадзеным артыкуле прадметам разгляду сталі апублікаваныя крыніцы, выдадзеныя Цэнтральным і губернскімі статыстычнымі камі-



тэтамі і якія ўтрымліваюць інфармацыю для аналізу сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў у Беларусі 60—90-х гадоў XIX ст.

Статыстычныя матэрыялы вельмі разнастайныя па свайму паходжанню, праграме і тэхніцы збора звестак, што стала прычынай часам несупаставімасці дадзеных крыніц. Па прычыне існуючых адрозненняў у задачах, якія стаялі перад складальнікамі крыніц у мінулым і навуковымі мэтамі сеняшніх даследчыкаў, інфармацыя статыстыкі мае нярэдка ўскоснае дачыненне да прадмета вывучэння, у прыватнасці, сацыяльнай структуры, сацыяльнай стратыфікацыі насельніцтва і інш. Паўстае праблема выяўлення скрытай інфармацыі, яе комплекснага выкарыстання. Пры працы з статыстычнымі крыніцамі трэба ўлічваць таксама, што на іх надзейнасць паўплывала тое, што статыстычныя дадзеныя закраналі непасрэдна інтарэсы людзей, сацыяльна-эканамічную сферу іх дзейнасці. Гэтым выклікана нярэдка наўмысная фальсіфікацыя крыніц. Часам яна адбывалася ад простага няведання, неразумення сутнасці запрошваемых паказчыкаў.

Улік насельніцтва ў Расійскай імперыі да 1860-х гадоў вёўся інтуітыўна, ацэначна. Пасля арганізацыі ЦСК пачынаюць публікавацца дадзеныя аб колькасці насельніцтва і яго зменах. Асноўнымі формамі ўліку жыхароў у 60—90-х гадах XIX ст. былі: адміністрацыйна-паліцэйскі, царкоўны, перапісы. Неўпарадкаванасць на месцах, слабы кантроль дакладнасці збіраемых звестак, адсутнасць спецыяльнай падрыхтоўкі ў зборшчыкаў дадзеных, ведамасная раз’яднанасць і ў сувязі з гэтым часта розныя праграма і методыка збору дэмаграфічных паказчыкаў з’яўляліся характэрнымі рысамі адміністрацыйна-паліцэйскага ўліку насельніцтва. Напрыклад, аб дваранстве звесткі назапашваліся ў губернскіх і павятовых дваранскіх сходах, аб мяшчанах — у гарадской думе, аб святарах — у духоўнай кансісторыі і г. д. Розныя звесткі аб саслоўным складзе жыхароў, характары яго заняткаў, маёмасным становішчы праз мясцовыя органы збіраліся ў дэпартаментах міністэрстваў унутраных спраў, фінансаў, дзяржаўных маемасцяў, герольдыі і інш. Матэрыялы для статыстыкі дасылаліся праз павятовую паліцыю. Інфармацыю яна давала нярэдка па свайму

разуменню, «на вока», не абцяжарваючы сябе удакладненнем і кантролем звестак. У справаздачы Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта за 1888 г. адзначалася, што збіраемыя дадзеныя атрымліваліся «... вельмі цяжка і з вялікімі пагрэшнасцямі, а ад многіх асоб, якія напрамую абавязаны садзейнічаць статыстычнаму камітэту

194

ў яго задачах, наогул нельга дачакацца звестак»[1]. Спецыяльнай падрыхтоўкі ў асоб, якія былі заняты зборам звестак аб насельніцтве, часцей за ўсё не было. У склад губернскіх статыстычных камітэтаў у большасці ўваходзілі чыноўнікі, якія па сваёй асноўнай працы і кваліфікацыі былі далёкімі ад статыстыкі. Тыповым у гэтых адносінах з’яўляўся склад Віцебскага каммітэта ў канцы 1880-х гадоў, да якога прыналежылі губернатар, віцэ-губернатар, прадвадзіцель дваранства, ігумен манастыра, рэктар духоўнай семінарыі і інш. Царкоўны ўлік праводзіўся праваслаўным, каталіцкім, іўдзейскім, мусульманскім, пратэстанцкім духавенствам адпаведна веравызнанню насельніцтва. Тут фіксаваліся дата нараджэння і смерці чалавека, яго саслоўная прыналежнасць.

Найбольш каштоўны, разнастайны, адносна даставерны матэрыял утрымліваюць матэрыялы першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва 28 студзеня 1897 г. Да яго правядзення неаднаразова ў розных частках Беларусі рабіліся спробы арганізацыі дэмаграфічных перепісаў. У 1874 г. Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства веў падрыхтоўку перапісу жыхароў гарадоў Віленскай губерні[2]. Магілеўскі губернатар у 1886 г. ставіў пытанне аб здзяйсненні перапісу насельніцтва ў губерні з мэтай удакладнення адбывання вайсковай павіннасці[3]. Праведзены перапіс насельніцтва 1897 г. быў грандыезным па задуме, але слаба падрыхтаваны. Жыхары не мелі дакладнага ўяўлення аб яго мэтах і задачах[4]. Малалікім быў кантынгент прафесійных статыстыкаў, не хапала перапісчыкаў. Непасрэдна ў ходзе правядзення перапісу справа часам даходзіла да анекдатычных выпадкаў. У Полацку адзін з перапісчыкаў быў абвінавачаны ў атрыманні хабару па 10 капеек з кожнага перапісанага ім дома[5]. Апрацаваная частка матэрыялаў дэмаграфічнага абследавання апублікавана ў пагубернскіх выданнях і спецыяльных зборніках. Падчас перапісу фіксаваліся звесткі аб усіх жыхарах, незалежна ад полу, узросту, нацыянальнасці. У лісты для апытання ўносіліся дадзеныя аб саслоўнай прыналежнасці ці стане жыхароў, месцы нараджэння, прапіскі і пастаяннага пражывання, адносінах да гаспадара і главы сям’і (сваяк, прыслуга, наемны работнік і інш.), занятках (асноўных і дадатковых), пісьменнасці, роднай мове[6]. Перапіс улічваў гаспадаркі і прадпрыемствы, дзе прымянялася наемная праца, а таксама асобна людзей, занятых працай па найму[7]. Дадзеныя абследавання падчас публікацыі былі разнесены па 25 табліцах, але яны не ўтрымліваюць поўнай інфармацыі, якая трапіла ў перапісныя лісты. Выдадзеныя па асобных губернях матэрыялы перапісу пры іх ад-

195

нолькавай праграме публікацыі ўсё ж у дачыненні некаторых табліц нераўнацэнныя. Напрыклад, у выданнях па Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях звесткі аб размеркаванні насельніцтва па месцу нараджэння дадзены па саслоўных групах, а ў публікацыях па Віленскай і Віцебскай губернях гэта інфармацыя больш падрабязная — па саслоўях.

Тым не менш, матэрылы перапісу ўяўляюць сабой параўнальна з статыстыкай XIX ст. найбольш даставерныя звесткі, якія дазваляюць характарызаваць сацыяльна-саслоўную, пола-узроставую і таксама структуру занятасці насельніцтва Беларусі. Даследчыкі вельмі павярхоўна выкарыстоўвалі апублікаваныя па беларускіх губернях матэрыялы перапісу[8]. Ніхто не зрабіў спробу комплексна прааналізаваць іх. Складанасць заключаецца ў аб’ёмнасці інфармацыі дэмаграфічных дадзеных і неабходнасці вялікай папярэдняй работы па прывядзенні іх у адпаведную даследчыцкай задачы таблічную форму, стварэнню базы дадзеных, выкарыстанню спецыяльнай методыкі апрацоўкі (метады шматмернага статыстычнага аналізу і інш.)

Сярод матэрыялаў аграрнай статыстыкі для аналіза і характарыстыкі сацыяльных працэсаў у Беларусі разглядаемага перыяду найбольшую каштоўнасць маюць дадзеныя статыстыкі землеўладання і землекарыстання. У 1877, 1887 і 1905 гг. ЦСК былі праведзены перапісы зямельнай уласнасці еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Падчас першага абследавання ўлічваліся прозвішча, саслоўная прыналежнасць ці званне землеўласніка, колькасць зямлі, якая яму належыла; у сельскай грамадзе ўлічвалася колькасць двароў, жыхароў і характар землекарыстання (падворны ці абшчынны). Вынікі перапісу па беларускіх губернях змешчаны ў 5-

м выпуску «Статистики поземельной собственнности и населенных мест Европейской России»[9]. У публікацыі прыведзены дадзеныя аб колькасці і памерах зямельных уладанняў падзеленыя па саслоўях і катэгорыях уладальнікаў. Найбольшую цікавасць уяўляюць табліцы аб памеры пазямельнай уласнасці з размеркаваннем на прыватную, абшчынную, казённую; аб прыватнаўласніцкай зямлі з размеркаваннем па памерах зямельных уладанняў; аб прыватнаўласніцкай зямлі з размеркаваннем па катэгорыях уладальнікаў; аб надзельных землях. Праграма перапісу 1887 г. у асноўным супадала з праграмай папярэдняга, але распрацоўка вынікаў яго для публікацыі была здзейснена па больш вузкай праграме і ў сувязі з гэтым апублікаваныя матэрыялы[10] праведзенага абследавання па шэрагу важных паказ-

**196**

чыкаў не супаставімыя з дадзенымі статыстыкі землеўладання 1877 г., а таксама і 1905 г. Акрамя таго, перапіс 1887 г. улічваў як зручныя землі сялянскіх надзелаў, так і няўдобіцы, чаго не было падчас абследавання 1877 г. Перапіс 1905 г. быў задуманы з мэтай выяўлення змен, якія адбыліся ў структуры землеўладання з 1877 г., пагэтаму яго праграма паўтарала праграму 1877 г.[11] Апублікаваныя матэрыялы абодвух абследаванняў дазваляюць характарызаваць іерархію землеўласнікаў па іх саслоўнай прыналежнасці і велічыні маёмасці, сацыяльныя працэсы сярод сялянства, памеры яго сацыяльнай дыферэнцыяцыі адпаведна велічыні землеўладання і землекарыстання. Названыя пытанні яны даюць магчымасць аналізаваць асобна па кожнаму са зрэзаў па часе, аднак іх супастаўленне ў дынаміцы абцяжарана тым, што ў дадзеных за 1877 г. прыводзіцца статыстыка землеўласнікаў, а за 1905 г. — уладанняў. Акрамя таго, паводле падлікаў В. П. Панюціча, падчас абодвух перапісаў па Беларусі былі не ўлічаны некалькі сотняў памешчыкаў і іх уладанняў[12].

Шмат гадоў айчынныя даследчыкі выкарыстоўвалі матэрыялы ваенна-конскіх перапісаў для аналіза і характарыстыкі класавага разлажэння сялянства на аснове групіроўкі іх гаспадарак па ступені забяспечанасці рабочай жывёлай. Магілёўская губерня стала адной з трох, дзе ўпершыню у 1875 г. быў праведзены падобны перапіс[13]. Апублікаваныя матэрыялы наступнага абследавання 1882 г.[14] не ўтрымліваюць звестак аб размеркаванні двароў па колькасці рабочых коней, што было б вельмі важна для устанаўлення групіроўкі сялян у пачатку 1880-х гадоў і для супастаўлення з дадзенымі наступных перапісаў. Вельмі каштоўныя звесткі для ранжыравання ўладальнікаў у залежнасці ад забяспечанасці іх коньмі прыводзяцца ў апублікаваных матэрыялах ваенна-конскіх перапісаў 1888 і 1900 гг.[15] Зацікаўленасць ваеннага ведамства ў правядзенні абследаванняў перадвызначыла высокую якасць статыстычнай інфармацыі. У пачатку XX ст. ваенна-конскія перапісы праводзіліся рэгулярна, але найбольш значны і супаставімы з дадзенымі абследаванняў XIX ст. матэрыял па беларускіх губернях утрымліваюць апублікаваныя матэрыялы ваенна-конскага перапісу 1912 г.[16] Стратыфікацыя сялянства айчыннымі гісторыкамі традыцыйна праводзілася на аснове групіроўкі сялянскіх гаспадарак на падставе колькасці коней, якія належалі гаспадарцы, і велічыні выкарыстоўваемай ворыўнай зямлі. Крытэрыямі такога іерахічнага ранжыравання сялянства былі на-

**197**

ступныя: уладальнікі гаспадарак без коней і з 1 канём адносіліся да ліку бедных; з 2 коньмі — да сярэдніх, з 3 і больш — да заможных; гаспадары з колькасцю ворыйнай зямлі да 4 дзесяцін — да бедных, звыш 8 дзесяцін — да заможных, астатнія да сяраднякоў. На аснове прыведзенай групіроўкі праводзілася сацыяльна-маёмасная іерархія сялянства такім чынам, што на мяжы XIX–XX ст. бяднейшая група складала звыш 60 % сялянства, сярэдняя па заможнасці — каля 30 %, багацейшая — каля 8—10 %.Аднак прыведзеныя крытэрыі і зробленая на іх аснове стратыфікацыя не бездакорныя. Пад ціскам нарастаючага к канцу XIX ст. беззямелля, вострай ва ўмовах Беларусі аграрнай перанаселенасці, сялянства вымушана было адыходзіць на промыслы, шукаць дадатковыя заработкі па-за межамі сваёй гаспадаркі, вёскі і г. д. Амаль палова сялян (адпаведна памерам аграрнай перанаселенасці) значную частку даходаў атрымлівала не праз сельскагаспадарчыя заняткі. У сувязі з гэтым больш аб’ектыўнай з’яўляецца пабудова маёмаснай іерархіі сялянства праз улік агульнага даходу сялянскай гаспадаркі на душу насельніцтва. Але рэпрэзентатыўныя дадзеныя аб сукупных даходах вясковых жыхароў адсутнічаюць.

Для характарыстыкі адной з сацыяльна-прафесійных груп — настаўнікаў, маюць каштоўныя звесткі матэрыялы адначаснага абследавання навучальных устаноў у сакавіку 1880 г.[17] Яны дазваляюць прааналізаваць колькасць, саслоўнае паходжанне, склад, узровень атрыманай адукацыі выкладчыкаў мужчынскіх і жаночых спецыяльных, сярэдніх навучальных устаноў і сельскіх вучылішчаў. За дзесяцігоддзі працы на старонках выданняў ЦСК былі апублікаваны таксама і іншыя шматлікія і разнастайныя статыстычныя матэрыялы, якія ўяўляюць безумоўную каштоўнасць для характарыстыкі асобных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва[18], змен колькасці і складу насельніцтва[19].

Інфармацыю для ЦСК прадстаўлялі губернскія статыстычныя камітэты, намаганнямі якіх, акрамя таго, выдаваліся памятныя кніжкі губерняў на пэўны год[20], агляды губерняў, гісторыка-статыстычныя апісанні[21] і інш. Памятныя кніжкі Віленскай губерні пачалі выходзіць з 1845 г., Віцебскай — 1861 г., Гродзенскай — 1859 г., Мінскай — 1860 г., Магілёўскай — 1853 г. Частку іх складаў статыстычны раздзел, дзе прыводзіліся звесткі аб колькасці і саслоўным складзе насельніцтва, яго дынаміцы, дадзеныя аб розных катэгорыях сельскіх жыхароў і інш. Аналагічную інфармацыю ўтрымлівалі часта агляды губерняў,



якія ўяўлялі сабой дадаткі да штогадовых справаздач губернатараў. Надзейнасць статыстычных дадзеных памятных кніжак і аглядаў губерняў носіць нярэдка праблемны характар, яны не правяраліся належным чынам і патрабуюць удакладнення праз супастаўленне са звесткамі іншых крыніц. Адным з найбольш цікавых і багатых інфарматыўна стала выданне Магілёўскага статыстычнага камітэта «Опыт описания Могилевской губернии…»[22], падрыхтаванае па праграме і пры непасрэдным удзеле губернатара і старшыні камітэта А.С. Дэмбавецкага. Колькасныя дадзеныя аб насельніцтве губерні прыведзены ў трэцяй кнізе.

Інфармацыйны рэсурс статыстычных крыніц дазваляе даследаваць сацыяльна-дэмаграфічныя працэсы ў Беларусі 60—90-х гадоў XIX ст. значна больш поўна, чым па папярэдніх перыядах, але ў гэтых крыніцах фактычна адсутнічаюць зводныя рэпрэзентатыўныя дадзеныя, якія неабходны для характарыстыкі дынамікі колькасці, складу буржуазіі, чыноўніцтва, інтэлігенцыі, духавенства, сацыяльнай мабільнасці насельніцтва Беларусі. Недастаткова лічбавых паказчыкаў для усебаковага разгляду мясцовага дваранства, сялянства, пралетарыяту, тэрытарыяльнай мабільнасці жыхароў і інш. Пэўнае выйсце з гэтай сітуацыі дазваляе знайсці поўнавартаснае выкарыстанне звестак іншых відаў крыніц, у тым ліку на мікра-гістарычным узроўні.

---

1 Отчет о занятиях Витебского губернского статистического комитета за 1886, 1887 и 1888 гг. Витебск, 1889. С. 18.

2 Расійскі цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў (РЦДГА) у С.-Пецярбургу, ф.1290, воп. 2, спр. 96, л. 1—19.

3 Там жа, спр. 262, л. 1.

4 Котельников А. История производства и разработки всеобщей переписи населения 28-го января 1897 г. СПб., 1909. С. 21—23.

5 РЦДГА ў С.-Пецярбургу, ф. 1290, воп. 10, спр. 167, л. 130.

6 Положение о Первой всеобщей переписи населения Российской империи. СПб., 1895. С. 2—4, 29—30.

7 Гл.: Распределение рабочих и прислуги по группам занятий и по месту рождения на основании данных Первой всеобщей переписи населения Российской империи 28 января 1897 г. СПб., 1905; Численность и состав рабочих в России на основании Первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 г. СПб., 1906. Ч. 1.

8 Гл.: Первая веобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1900—1904. Вып. IV. Виленская губерния. Тетради 1—3; СПб., 1899—1903. Вып. V. Витебская губерния. Тетради 1—3; СПб., 1904. Вып. XI. Гродненская



губерния; СПб., 1904. Вып. XXII. Минская губерния; СПб., 1903. Вып. XXIII. Могилевская губерния.

9 Статистика поземельной собственности и населенных мест Европейской России. Вып. 5. Губернии Литовской и Белорусской групп. 1. Виленская, Ковенская, Гродненская. 2. Минская, Витебская, Могилевская, Смоленская. СПб., 1882.

[10] Главнейшие данные поземельной статистики по обследованию 1887 года. СПб., 1897. Вып. 4. Виленская губерния; СПб., 1898. Вып. 5. Витебская губерния; СПб., 1896. Вып. 11. Гродненская губерния; СПб., 1896. Вып. 22. Минская губерния; СПб., 1893. Вып. 23. Могилевская губерния.

[11] Статистика землевладения 1905 г. СПб., 1906. Вып. 11. Гродненская губерния; СПб., 1906. Вып. 15. Могилевская губерния; СПб., 1906. Вып. 19. Минская губерния; СПб., 1907. Вып. 27. Витебская губерния; СПб., 1906. Вып. 34. Виленская губерния.

[12] Панютич В.П. Помещичье землевладение в Белоруссии во второй половине XIX в. // Проблемы аграрной истории: В 2 ч. Мн., 1978. Ч. 2. XIX – 30-е годы XX в. С. 69—70.

[13] Конская перепись в Европейской России. По сведениям 1875 года. Могилевская губерния. СПб., 1876.

[14] Конская перепись 1882 г. СПб., 1884.

[15] Военно-конская перепись 1888 г. СПб., 1891; Военно-конская перепись 1899—1901 гг. СПб., 1902.

[16] Военно-конская перепись 1912 г. Пг., 1914.

[17] Статистика Российской империи. СПб., 1888. Вып III. Университеты и средние учебные заведения 50-ти губерний Европейской России и 10-ти Привисленских по переписи 20-го марта 1880г.; СПб., 1890. Вып. VIII. Специальные учебные заведения мужские и женские в 50-ти губерниях Европейской России и 10-ти губерниях Привисленских по переписи 20 марта 1880 года; Статистический временник Россиийской империи. СПб., 1884. Сер. III. Вып. I. Сельские училища в Европейской России и Привисленских губерниях.

[18] Статистика Российской империи. СПб., 1888. Вып. II. Статистика слепых в России по переписи 1886 г.; СПб., 1890. Вып. XIII. Проституция по обследованию 1 августа 1889 г.

[19] Для вывучэння дынамікі насельніцтва Беларусі за многія гады цікавасць маюць шматлікія выпускі «Движение населения в Европейской России за ...», якія выдаваліся з 1885 г. Гл.: Статистика Российской империи. СПб., 1890—1916. Вып. XI, XII, XVIII, XXI, XXIV, XXXIII, XXXIV, XXXVIII, XLI, XLV, XLVII, XLVIII, L, LVI, LVIII, LXII, LXIII, LVI, LXX, LXXIV, LXXXIV, LXXXV, LXXXVII, LXXXVIII, XCI, XCIII.

[20] Спіс апублікаваных па беларускіх губернях памятных кніжак прыведзены: Балацкая Н. М. Раздорский А. И. Памятные книжки губерний и областей Российской империи (1836—1917). Предварительный список. СПб., 1994.

[21] Гл.: Труды Минского губернского статистического комитета. Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии. Мн., 1870.

[22] Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях. В 3 кн./ Под ред. А. С. Дембовецкого. Могилев-на-Днепре, 1882—1884.